# Зімовае чараўніцтва

**У галерэі «Універсітэт культуры» праходзіць IV штогадовая выстаўка-конкурс дзіцячага мастацтва «Зімнія ўражанні». Вучні з розных школ паказваюць свае работы і атрымліваюць ацэнку экспертнага журы, у склад якога ўваходзяць прафесійныя мастакі і выкладчыкі выяўленчага мастацтва. Удзельнікі ацэньваюцца ў трох узроставых катэгорыях: 6—10, 11—13, 14—17 гадоў. Мэта конкурсу — падтрымаць падлеткаў, якія займаюцца выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам.**

Маладым аўтарам прапанавана адлюстраваць свае эмоцыі і пачуцці пра зімовую пару ў жывапісе, скульптуры, графіцы. Калі глядзіш на творы дзяцей, адчуваеш святочную атмасферу, дух чараўніцтва і верыш у лепшае. Асноўнымі тэмамі, абранымі маладымі творцамі, сталі Калядкі, зімовы вечар, заснежаны Мінск, а таксама гульні і пейзажы. Вялікую частку экспазіцыі складаюць карціны. Мастакі працуюць у розных тэхніках і з рознымі матэрыяламі, але ў кожнай рабоце адчуваецца свой аўтарскі стыль. Аматары жывапісу адразу заўважаць, каму з юнакоў бліжэй экспрэсіянізм, каму — рэалізм, а хто выбраў для сябе шлях знакамітага Ван Гога. Зімовая тэматыка прадугледжвае адпаведныя колеры. Выстаўка ахутвае «халоднай» атмасферай сінявата-чорнага неба, бялюткага снегу, рознакаляровымі святочнымі ялінкамі. У паўсядзённасці з-за хуткага тэмпу мы не заўважаем, які цудоўны свет вакол нас. Але дзеці больш чулыя да прыгажосці, яны ўсё прыкмячаюць: нават у звычайных рэчах можна ўбачыць нешта дзіўнае і чароўнае, у прыватнасці ў вячэрнім Мінску і яго шматпавярховіках.



Яўгенія Емяльяненка «Зюзя».

Цікава назіраць, як сучасныя дзеці бачаць Калядкі. Нацыянальныя традыцыі не забываюцца, а атрымліваюць новыя рысы сучаснасці. Для сваіх карцін аўтары выкарыстоўвалі фарбы, махеравыя ніткі і воўну.

Можна ўбачыць і творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сцэны народных гулянняў, незвычайныя ялінкі і самы «зімовы» персанаж беларускай міфалогіі — Зюзя — таксама знайшлі сваё месца ў сценах галерэі. Работы выкананы ў розных тэхніках і напрамках: гэта і валянне, і разьба па дрэве, і фларыстычныя кампазіцыі. Асаблівае ўражанне робяць шахматы, зробленыя з керамікі, таксама на тэму Калядак. Сустракаюцца і рэлігійныя матывы. Гэта работы больш дарослых вучняў, якія будуць ацэньвацца ва ўзроставай катэгорыі 14—17 гадоў. Знайшлі адлюстраванне ў творчасці хакей і зімовая рыбалка.

Прыцягвае ўвагу незвычайная ёлка «Васілінка», зробленая Яўгеніяй Емяльяненка. Гэтая ёлка з валошак адначасова стварае святочную навагоднюю атмасферу і вяртае нас да нацыянальных традыцый.

Пасля падвядзення вынікаў арганізатарамі будзе падрыхтаваны электронны каталог, дзе можна яшчэ раз убачыць творы маладых аўтараў, размешчаныя ў экспазіцыі.

Выстаўка-конкурс «Зімовыя ўражанні» не толькі адкрывае таленты, якія, магчыма, пазней стануць новымі зоркамі беларускага мастацтва, — такія мерапрыемствы даюць нам магчымасць паглядзець на шэрую і марозную пару года па-новаму — з дзіцячай наіўнасцю і верай у цуды, з любоўю да роднай прыроды, з захапленнем такой звычайнай паўсядзённай эстэтыкай.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА, фота аўтара**



*Паліна Ракоць «Зімні вечар».*



*Мікіта Фралоў «Навагодні экспрэс».*



*Мар'я Пытляк «Прыйшла Каляда, прынясла нам усім дабра».*